*М.І.АКСЮЦІК*

# АСАБЛІВАСЦІ ДАСЛЕДАВАННЯ САЦЫЯЛЬНА-КУЛЬТУРНАЙ ДЗЕЙНАСЦІ

Сучасная тэорыя сацыяльна-культурнай дзейнасці сінтэзуе шэраг тэорый, генетычна звязаных з ёй па прыметах адзінства гісторыі і прадметнага поля навукі, метадалагічнай агульнасці работы самых розных навуковых, грамадскіх і культурна-асветных арганізацый. Яна інтэнсіўна ўзбагачаецца культуралагічнымі, сацыялагічнымі, культурна-антрапалагічнымі, псіхолага-педагагічнымі ідэямі, якія вызначаюць новую якасць выхаваўчай дзейнасці ў соцыуме, інавацыйны характар тэхналогій арганізацыі культурнай сферы вольнага часу.

Сацыяльна-культурная дзейнасць (СКД) сённяшняга часу — гэта самастойная, цэласная, складанаарганізаваная галіна педагагічнай навукі. Яна з'яўляецца заканамерным працягам педагагічных пошукаў, якія праводзіліся ў нашай краіне ў рамках тэорыі пазашкольнага выхавання, палітыка-асветніцкай работы, клубазнаўства, культурна-асветніцкай і культурна-адпачынкавай работы. Сучасная сацыяльна-культурная дзейнасць адрозніваецца ад той, што праводзілася раней, па цэлым шэрагу параметраў.

Найбольш важным з'яўляецца змяненне базавых уяўленняў аб самой дзейнасці, яе ролі ў фарміраванні асобы.

Навукоўцы згодны з думкай, што сацыяльна-культурная дзейнасць дапамагае выхаваць у асобы актыўныя адносіны да рэчаіснасці, якія выяўляюцца ў спажыванні, вытворчасці і распаўсюджванні каштоўнасцей культуры.

А.В.Сасыхаў і Ю.А.Стральцоў упершыню звярнулі ўвагу на метадалогію навукі аб культурна-асветніцкай дзейнасці. У працы "Асновы клубазнаўства: тэорыя і методыка клубнай работы" яны раскрылі тэарэтычныя асновы гэтай навукі. Аўтары свядома робяць акцэнт на тым, што, уваходзячы ў склад педагагічнай навукі і грунтуючыся на агульных заканамернасцях тэорыі выхавання, навука аб сацыяльна-культурнай дзейнасці ў той жа час мае самастойнасць і якасную спецыфіку. Яна даследуе такую сферу сацыяльнай практыкі, якая не вывучаецца ва ўсёй сукупнасці ніводнай іншай навуковай дысцыплінай [2].

У тэарэтычным раздзеле падручніка "Клубазнаўства" (1980), падрыхтаваным пад рэдакцыяй С.М.Іконнікавай і В.І.Чэпелева, падкрэсліваецца, што ў сацыяльна-культурнай дзейнасці яе арганізатарам трэба "зыходзіць з ідэі адзінства педагагічнага кіраўніцтва і самадзейнасці мас, з неабходнасці ўліку накіраванага фарміравання інтарэсаў працоўных" [1, с. 11].

Распрацоўваючы ў свой час канцэпцыю педагагічнай дзейнасці клубаў, якія ўваходзяць у сістэму культурна-асветніцкай работы, У.Я.Трыодзін аналізуе спецыфіку гэтай сістэмы [3]. Ён падкрэслівае, што ў ёй педагогіка прымаецца як тэорыя больш высокага ўзроўню, адносна якога тэорыя сацыякультурнай дзейнасці — гэта тэорыя сярэдняга ўзроўню. Таму ў гэтай тэорыі адсутнічае ўласная, характэрная толькі для яе метадалогія. Адказваючы на пытанне: "У чым выяўляецца спецыяльны характар гэтай метадалогіі адносна тэорыі культурна-асветніцкай дзейнасці?" — У.Я.Трыодзін, таксама як і іншыя даследчыкі, указвае на спецыфіку прадметнай сферы культурна-асветніцкай работы.

Думку У.Я.Трыодзіна падзяляе М.М.Ярашэнка. Ён адзначае, што педагагічная навука задае сістэму прынцыпаў, паняццяў і метадаў даследавання, прызначаных інтэрпрэтаваць толькі некаторую частку сацыяльных фактаў і сацыяльнай рэальнасці, звязаных з працэсам выхавання і адукацыі. А ўжо на ўзроўні спецыяльнай метадалогіі адбываецца найбольшая канкрэтызацыя прынцыпаў і метадаў даследавання, фарміруецца асаблівая сістэма прыватнанавуковых катэгорый, прызначаных растлумачыць тую частку сацыяльных фактаў і сацыякультурнай рэальнасці, якая складае прадметную галіну сацыяльна-культурнай дзейнасці — выхаванне і развіццё асобы ў спецыфічных сітуацыях вольнага часу і творчасці [4].

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

Падобнага роду шматузроўневая структура метадалогіі СКД дазваляе вызначыць яе спецыфіку, прынцыповае адрозненне, напры-клад, ад метадалогіі культуралогіі і метадалогіі сацыялогіі, якія вельмі цесна судакранаюцца ў тэарэтычным плане з прадметнай сферай навукі аб культурна-асветніцкай дзейнасці.

Са сказанага вынікае, што міждысцыплінарны сінтэз можа ажыццяўляцца толькі на розных узроўнях: агульнанавуковым, інтэгратыўным і спецыяльна навуковым. Такім чынам, пераход метадалагічных ідэй на больш агульныя ўзроўні або больш канкрэтныя (“па вертыкалі”) магчымы толькі пасля таго, як гэтыя ідэі вызначаны канкрэтнай навукай на ўзроўні ўзаемадзеяння з побач размешчанымі навуковымі дысцыплінамі (“па гарызанталі”).

Таму ў структуры спецыяльнай метадалогіі СКД не могуць самастойна функцыянаваць метадалагічныя ідэі сацыялогіі, культуралогіі, псіхалогіі і іншых грамадскіх навук. Толькі будучы ўдакладненымі на ўзроўні агульнай педагогікі, яны пераходзяць на спецыяльны, уласна навуковы ўзровень метадалогіі тэорыі сацыяльна-культурнай дзейнасці. Схематычна гэта можа быць прадстаўлена ў выглядзе “лейкі”.

Метадалогія грамадскіх навук

Метадалогія педагагічнай навукі

Метадалогія сацыяльна-культурнай дзейнасці

Ідэі, сфарміраваныя ў шматлікіх метадалагічных кантэкстах (агульнафіласофкім, інтэгратыўным), трансліруюцца на ўзровень спецыяльнай метадалогіі толькі па каналу ўзаемадзеяння галіновай тэорыі з той тэорыяй больш высокага ўзроўню, з якой дадзеная галіновая тэорыя звязана генетычна і сутнасна. Пры даследаванні асобных тэарэтычных праблем адбываецца пашырэнне як зыходных метадалагічных аспектаў, спецыфічных для тэарэтычнага зместу канкрэтнага даследавання, так і крыніц тых навуковых ведаў, якія педагогіка асімілюе.

Такім чынам, будучы спецыяльнай навукай, маючай сваё спецыфічнае поле навуковай дзейнасці (культурную сферу вольнага часу і развіццё самадзейнай мастацкай творчасці), сацыяльна-культурная дзейнасць грунтуецца на ідэях многіх агульнаграмадскіх дысцыплін, выкарыстоўвае іх, трансліруючы праз прызму агульнай педагогікі. У сваю чаргу, спецыяльная метадалогія СКД узбагачае агульнапедагагічную ідэямі сацыяльна-культурнага зместу, адначасова робіць больш грунтоўнай, змястоўнай і "ачалавечанай" метадалогію грамадскіх навук.

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

---

1. *Клубоведение:* Учеб. пособие для ин-тов культуры, искусств и фак-тов культ.-просвет. работы пед. ин-тов / Под ред. С.Н.Иконниковой и В.И.Чепелева. — М.: Просвещение, 1980.

2. *Сасыхов А.В., Стрельцов Ю.А.* Основы клубоведения: теория и методика клубной работы. — Улан-Удэ: Улан-Уд. ин-т культуры, 1969.

3. *Триодин В.Е.* Теоретические основы воспитательной деятельности советского клуба: Дис... д-ра пед. наук: 13.00.05. — Л., 1985.

4. *Ярошенко Н.Н.* Социально-культурная деятельность: парадигмы, методология, теория. — М.: Моск. гос. ун-т культуры, 2000.